**Кузьміч, Т.** «Ён гэтак многа ведае, каб жыць…» / Т. Кузьміч // Віцебскі рабочы. – 1994. – 29 ліп. – С. 1.

## «ЁН ГЭТАК МНОГА ВЕДАЕ, КАБ ЖЫЦЬ…»

Многія гады неставала беларускай літаратуры гістарычнай прозы. Напэўна, не нарадзіўся яшчэ талент асобага роду, які б меў не толькі запас канкрэтных гістарычных ведаў, але і валодаў яркім паэтычным уяўленнем, каб увасобіць у літаратурным творы сівую мінуўшчыну таго народа, з якога выйшаў сам. Але літаратура, як і жыццё, як і прырода, не церпіць пустаты. Ён з'явіўся, гэты талент, гэты адметны і самабытны пясняр зямлі беларускай, «зямлі пад белымі крыламі», у асобе ўзнёслага самабытнага паэта, яркага апавядальніка, удумлівага даследчыка гістарычных падзей, на якія багата мінулае Беларусі. Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч... Лёс наканаваў яму нядоўгае, але напоўненае сэнсам жыццё. І пакінуў ён пасля сябе такую спадчыну, якой будуць захапляцца не адно стагоддзе. Быў, ёсць, буду!.. Тры магічныя словы, сказаныя ім, як прароцтва.

10 гадоў мінула пасля смерці гэтага цудоўнага чалавека. Памянуць яго прыехалі ў Віцебск сябры. Чаму менавіта ў Віцебск? Ды таму, што і тут у яго шмат сяброў і прыхільнікаў творчасці. Таму, што ў коласаўскім тэатры сцэнічна былі ўвасоблены яго гістарычныя драмы «Кастусь Каліноўскі», «Званы Віцебска» і «Маці ўрагану». І яшчэ таму, што ў гэты дзень віцябляне, аддаючы даніну павагі вядомаму празаіку, паэту і драматургу, адкрывалі яму помнік. На высокім месцы, сярод зеляніны і кветак, пад векавымі дрэвамі, каб пясняр быў бліжэй да прыроды.

Артысты-коласаўцы чыталі пранізлівыя радкі Уладзіміра Сямёнавіча, спявалі песні на яго вершы. Кіраўнік рок-гурта «Грамада» кампазітар Генадзь Шэмет прадставіў на суд прысутных урыўкі з оперы «Ладдзя роспачы», работа над якой зараз ідзе ў тэатры. Добрыя словы пра Уладзіміра Караткевіча сказалі мэр Віцебска Валерый Неушаў, міністр культуры і інфармацыі рэспублікі Анатоль Бутэвіч, яго намеснік паэт Генадзь Бураўкін, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Васіль Зуёнак, былы галоўны рэжысёр коласаўскага тэатра Валерый Мазынскі. А паэты Алег Салтук, Давід Сімановіч, Пятрусь Макаль прачыталі вершы, прысвечаныя свайму настаўніку, сабрату па пяру. Асабліва ўрэзаўся радок з верша, напісанага Уладзімірам Някляевым: «Ён гэтак многа ведае, каб жыць...»

І вось урачыстая хвіліна: спадае пакрывала – і вачам прысутных адкрываецца твар Мастака. Ён задумліва глядзіць на пакуль яшчэ сваё пакаленне, быццам вывучае яго. Гэтак жа будзе глядзець ён і праз стагоддзі на нашчадкаў.

Помнік дарагому сэрцу кожнага беларуса чалавеку стварылі віцебскія скульптары Іван Казак і Валерый Рыбакоў.

На адкрыцці помніка Уладзіміру Сямёнавічу Караткевічу прысутнічалі Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М. І. Грыб, старшыня абласнога Савета дэпутатаў У. П. Кулакоў, віцябляне і шматлікія госці III Міжнароднага музычнага фестывалю «Славянскі базар».

**Таццяна Кузьміч**